# АБ ЛЕТНІМ ПРАЕЗДЗЕ Ў МЕТРО ВЫПУСКНІКОЎ І ВУЧНЯЎ СЯРЭДНІХ ШКОЛ

21 МАЯ 2018 г.

Камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама растлумачыў парадак праезду вучняў у грамадскім транспарце, у тым ліку ў Мінскім метрапалітэне, у летні перыяд гэтага года.

Па-ранейшаму права бясплатнага праезду ў метрапалітэне прадастаўляецца вучням або выхаванцам устаноў агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі горада Мінска на падставе электроннай карты вучня або даведкі з бягучым тэрмінам дзеяння.

У сувязі з заканчэннем навучальнага года гэтыя дакументы патрабуюць абнаўлення для праезду ў грамадскім транспарце.

Акрамя таго, **неабходна абнавіць даведкі для праезду на перыяд з 01.07.2017 г. да 31.08.2018 г. тым вучням (у тым ліку выпускнікам 9 класаў)**, якія ў летні перыяд будуць задзейнічаны ў рэалізацыі праграм дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, праграм выхавання і аздараўлення, а таксама дзецям і падлеткам, якія прымаюць удзел у буйнамаштабных масавых мерапрыемствах.

Вучні 11-х класаў маюць права карыстацца бясплатным праездам у метрапалітэне да **10 чэрвеня 2018 г.** уключна, г. зн. да моманту заканчэння здачы выпускных экзаменаў і адлічэння іх з устаноў адукацыі.

**Просім звярнуць увагу на тэрмін дзеяння даведак і своечасовасць іх замены.**